# Мадэрн з **працягам**

**XXII Міжнародны фестываль сучаснай харэаграфіі ў Віцебску (IFMC) засведчыў: беларускі "мадэрн" (не блытаць з класічным балетам!) калі не "наперадзе планеты ўсёй", дык, па меншай меры, "на ўзроўні". І, галоўнае, развіваецца, дзякуючы самаадданаму энтузіязму, сямімільнымі крокамі. Бо нумары, паказаныя ўдзельнікамі Беларускага конкурсу, пераўзыходзілі большасць замежных і па творчым крэатыве, і па выканальніцтве.**

"Прадказанне" такой сітуацыі грымнула яшчэ летась: нашы ўдзельнікі — тэатр "D.O.Z.SK.I" — упершыню аказаліся лаўрэатамі Міжнароднага конкурсу, які на гэтым фестывалі чаргуецца з Беларускім. Раней стабільна эксперыментаваў хіба гродзенскі "ТАД", дайшоўшы да спецыяльнага прыза імя Яўгена Панфілава. Агульная планка прафесіяналізму рэзка пайшла ўгару, калі на "конкурсную сцяжыну" выйшаў Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў. Сёлета ансамбль кафедры харэаграфіі БДУКіМ стаў пераможцам у намінацыі "Выканальніцкае майстэрства". Дый узнагароды многіх іншых калектываў у той ці іншай меры былі абумоўлены ўдзелам выхаванцаў кафедры пад кіраўніцтвам Святланы Гуткоўскай. І вымусілі задумацца, наколькі мы недаацэньвалі тое, што зроблена кафедрай за апошнія гады менавіта ў сферы сучаснай харэаграфії.

Асучасніліся фальклорныя напрамкі, у бок XXI стагоддзя зрушыла эстэтыка многіх аматарскіх танцавальных калектываў, у грамадстве пачало фарміравацца асацыятыўнае пластычнае мысленне, што ахапіла і драматычны тэатр, і ўласна музычныя напрамкі. І гэта прытым, што кожны новы харэаграфічны праект БДУКіМ дэманструецца на публіцы не больш за адзін-два разы. А трэба — 22 і нават 222, бо яны таго каштуюць!

У намінацыі "Лепшая пастаноўка" міжнародным журы былі адзначаны аднаактовыя балеты тэатра "D.O.Z.SK.I": "Камень, нажніцы, папера" і "Homo sapiens". У намінацыі "Артыстызм" — Вольга Лабоўкіна са сваім аднаактовым "Вяселлейкам" (тэатр "Karakuli"). Намінацыю "Традыцыі і наватарства" журы замяніла на прэмію "Лепшая харэаграфічная мініяцюра", якая паехала ў Гродзенскую абласную філармонію да згаданай групы "ТАД". Мініяцюра "Туманы" дадаткова раз падкрэсліла, што харэограф Дзмітрый Куракулаў ужо можа лічыцца "жывым класікам" сучаснай беларускай харэаграфіі. Нумар вызначаўся кампазіцыйнай завершанасцю, сапраўды "высокім стылем" лексічных пошукаў, дзівоснай гармоніяй музыкі, рухаў, агульнага відовішча. "Прачытвалася" ў ім і мастацкая "звышзадача": вырашыць неакласічнае, па сутнасці, Адажыо, літаральна "не сыходзячы з месца". Салісты з'яўляюцца быццам з нейкага кокана — і пачынаецца іх паэтычнае кружэнне, аздобленае арыгінальнымі і вельмі прыгожымі харэаграфічнымі падтрымкамі. Але тое "замкнёнае кола" ператвараецца ў мора пяшчотных рамантычных пачуццяў, у сусвет "Я+Я=Мы". Старая (а лепей — вечная) тэма зіхаціць не толькі навізной, але і папраўдзе творчым працягам традыцый нашага сусветна вядомага харэографа, народнага артыста СССР, прафесара Валянціна Елізар'ева, Адажыо якога, нават змешчаныя ў кантэкст глыбока канцэпцыйных філасофскіх балетаў, не перастаюць здзіўляць тонкім псіхалагізмам і пластычнай адметнасцю.





Кожны чарговы IFMC падкідвае свае "тэмы для роздуму". На сёлетнім фестывалі панавалі гэткія "побытавізмы", варыяцыі на тэмы "Мужчына і жанчына", "Я прыйшоў, а ты пайшла", было шмат парадыйнасці, неадпаведнасцей назвы пастаноўкі ўе зместу, лексічных "мініцытат", калі нумар складаецца з дробных часцінак, кожная з якіх была "прыдумана не намі" і, тым больш, "не мной". Але сярод безлічы тых "дэталей канструктара" прыемна было заўважаць "злепкі" не толькі з сусветных знаходак, але і са сваіх, беларускіх, асабліва часта — усё таго ж Дзмітрыя Куракулава. Можа, наспеў час прапанаваць і яму правесці майстар-класы? Тым больш, што апошнім часам ён атрымаў прызнанне і ў замежжы: заўтра, 29 лістапада, адбудзецца прэм'ера яго балета "Акіян" у Беластоку, пастаўленага для тамтэйшага калектыву "Danceoffnia".

Увогуле ж, майстар-класы, што трывала практыкуюцца на IFMC, маглі б стаць тымі "спробнымі ўрокамі", па якіх кожны, хто жадае павысіць сваю кваліфікацыю, мог бы зарыентавацца, наколькі яму блізкі менавіта гэты кірунак і сама творчая асоба пэўнага харэографа і выкладчыка. За адзін-два заняткі, накат калі выкладчык прыязджае некалькі гадоў запар, пераняць новую манеру немагчыма. А вось абраць, у каго хацелася б займацца і надалей, — абсалютна рэальна.

Калі ўкраінка Таццяна Астраверх прапаноўвала паўтарыць за ёй тыя ці іншыя рухі, блізкія неакласіцы, дык Дзяніс Барадзіцкі (Расія) вучыў лепей адчуваць сваё цела, перамяшчаючыся ў прасторы, быццам то пашыраючы яе, то звужваючы. Нарэшце, імправізаваць, зыходзячы з уласных адчуванняў і рухаў партнёраў.

З разнастайнай гасцявой праграмы выбіваліся шоу-нумары, разлічаныя на касавы поспех. Асабліва крыўдна было, што паказваў іх Пермскі дзяржаўны "Балет Яўгена Панфілава", які пры жыцці майстра заставаўся сапраўдным "заканадаўцам мод", скараючы адну творчую вяршыню за другой. А больш за ўсё ўразілі шведы: і кінапаказам, і энергетычна насычаным майстар-класам Марыкі Хедэмір, і танцавальнымі "выбрыкамі" на сяброўскай вечарынцы, і пластычнай "інсталяцыяй" у фае Канцэртнай залы "Віцебск" перад канцэртам закрыцця. Але ж так хацелася ўбачыць штосьці шведскае і на сцэне!

Дзякуючы тэарэтычным майстар-класам Маргарыты Мойжэс (Германія), Віты Мазурайтэ (Літва) беларусы спасцігалі сакрэты менеджменту ў галіне сучаснага танца, знаёміліся з самымі нашумелымі замежнымі праектамі. І чым далей, тым больш узмацнялася думка: у сучаснай харэаграфіі самым важным, бадай, становяцца нават не новыя тэмы і новыя мастацкія сродкі, а новы, арыгінальны погляд на тое, што мы бачым штодзень.

Але ж ці будзе заўважаны гэты наш "новы погляд" у замежжы? Сёлета IFMC паспрабаваў вырашыць і гэтую праблему. На фестываль былі запрошаны прадстаўнікі Дзюсельдорфскага міжнароднага кірмашу танца, польскай Асацыяцыі міжнароднага супрацоўніцтва ў галіне культуры і мастацтва "Artbale" і іншых уплывовых арганізацый. Яны былі прыемна здзіўлены ўбачаным. Таму — будзем чакаць працягу.

**На здымках: сцэна з балета "Homo sapiens" (тэатр "D.O.Z.SK.I"); сцэна з мініяцюры "Туманы" (група "ТАД"). Фота Івана АСТАШОНКА**